УДК 94(476)

# КАНТРОЛЬ ШЛЯХЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ НАД ГАРАДСКІМ САМАКІРАВАННЕМ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII СТАГОДДЗЯ

***С.П. СТРЭНКОЎСКІ***
*Мінскі дзяржаўны інстытут развіцця адукацыі,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Уводзіны.** Узаемаадносіны гарадскога самакіравання і шляхецкай дзяржавы Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII стагоддзя з'яўляеюцца пытаннем, якое вельмі мала даследавана ў айчыннай гістарыяграфіі. Дзейнасць камісій добрага парадку, парадкавых цывільна-вайсковых камісій, камісій паліцыі разгледжана Я. Анішчанкам у адпаведных артыкулах энцыклапедычных выданняў [1, 46–48; 2, с.25–26]. Узаемадачыненні магістратаў і камісіі добрага парадку ў Гродне, ваенна – цывільных парадковых камісій з органамі гарадога самакіравання даследаваў Ю. Гардзееў [3; 4]. Прывілеі і вількеры беларускіх гарадоў названага перыяду разгледжаны ў манаграфіі С. Стрэнкоўскага [5]. Другая палова XVIII стагоддзя для Рэчы Паспалітай, якая апынулася ў крызісным становішчы, характэрна шматразовымі спробамі рэфармавання дзяржаўнага ладу, эканамічных і сацыяльных адносін. Многія з гэтых рэформаў закранaлі гарады і іх самакіраванне. Прагрэсіўныя рэфарматары спрабавалі прыдаць мяшчанскаму саслоўю новы, роўны са шляхтай, статус, павысіць ролю гарадоў у жыцці краіны. Аднак шляхецкая большасць ставілася да гэтага вельмі насцярожана і імкнулася захаваць кантроль за гарадскім жыццём. Для гэтага ўтвараліся асобныя органы. Высвятленне іх функцый і ўплыва на стан гарадоў дазволіць больш дакладна ўявіць стан гарадскога самакіравання ў вельмі важны перыяд гісторыі нашай краіны.

**Асноўная частка.** Безумоўна, што спробы рэфармавання дзяржаўнага механізма ў цэлым і розных яго бакоў у прыватнасці, якія распачаліся ў 60-я гады XVIII стагоддзя, не маглі не закрануць гарады і іх самакіраванне. Ужо канвакацыйны сейм 1764 года ў Варшаве прыняў канстытуцыю «Умовы гарадоў ВКЛ», дзе звярнуў увагу на гаротны стан гарадоў і прыняў шэраг загадаў па абмежаванню пастояў, гандлю, які праводзіўся кляштарамі, перадачы гарадскіх маёмасцей і прыватнай уласнасці ў гарадах у рукі духавенства, па вяртанню юрыдык пад гарадскую судовую юрысдыкцыю [6, с.74–75]. Пры гэтым палітыка шляхецкай дзяржавы ў дачыненні да гарадоў ўсё ж працягвала заставацца супярэчлівай. Каранацыйны 1764 года сейм забараніў прымаць да актыкацыі ў магістрацкіх кнігах ўсе запісы, якія не датычацца мяшчан і гарадскіх зямель і пляцаў і, разам з тым, прыцягваць гарады і мяшчан у іншыя суды акрамя асэсарскага задворнага [6, с.241–242].

8 жніўня 1765 года асэсарскі суд стварыў спецыяльную камісію boni ordinis («добрага парадку»), якая павінна была рагглядзець прывілеі і іншыя акты Варшавы, даследаваць стан гарадскіх фундушаў, гарадской гаспадаркі, высветліць магчымыя злоўжыванні ў кіраванні горадам. Аб выніках сваёй працы камісія павінна была паведаміць суду [7, с.6].

Аналагічны характар мела камісія, якая была накіраванна ў мястэчкі Гродзенскай эканоміі: Ліпск, Крынкі і Новы Двор. 22 верасня 1766 года ў гарадскія актавыя кнігі Ліпска была занесена пастанова каралеўскіх камісараў пад кіраўніцтвам інфлянцкага біскупа Стэфана Гедройца. Камісары адзначылі, што «цяперашнія абываўцелі, абараняючыся магдэбургскім правам, ані рамяством не займаюцца, ані старання не маюць, каб прыстойнае жыллё мець, ані таксама гандлю не праводзяць, а ў цэлым дазволеныя сабе манархамі вольнасці дарэмна ўжываюць, не прыносячы гарадам ніякай карысці». Пастанова прадпісвала, каб тыя, хто жыве пад магдэбургскім правам, займаліся рамяством і гандлем, будавалі сабе прыстойныя дамы з добрымі комінамі, таксама, каб згодна сваім магчымасцям уносілі падаткі ў гарадскі скарб. Асобна адзначалася, каб гарадскія падаткі ішлі толькі на агульныя патрэбы горада, яго рамонт, практыкаванне моладзі ў навуках, найм для гэтага «дарэктараў». Аб гарадскіх даходах і расходах штогод магістрат павінен быў рабіць «калькуляцыю». Тыя ж, хто не займаўся гандлем і рамяством, не меў прыстойных дамоў, а толькі вёў сельскую гаспадарку, «не аздобу, а прыцямненне гораду прыносячы», павінны былі з валокі на тыдзень адпрацоўваць 2 дні і штогод 4 шарваркі: вывозіць дрэва, будаваць дамы, школу, цагельню, рамантаваць ратушу, масты і грэблі, рабіць цэглу, звозіць камні для брукавання вуліц, або выплочваць па палове злотага, што кожны тыдзень павінны былі ўлічваць прадстаўнікі магістрата [8, а.31-33].

ПолесГУ

Канстытуцыя «Умовы гарадоў і мястэчак нашых каралеўскіх у Кароне і ў ВКЛ» 1768 года, пацвердзіўшы ранейшыя правы гарадоў і мястэчак, па грамадзянскіх справах магістрата і апеляцыях мяшчан на грамадзянскія справы, вырашаныя магістратам, падначаліў іх суду старосты, а па крымінальных справах – адпаведна асэсарскаму задворнаму суду. Адначасова камісіі boni ordinis павінны былі навесці парадак з фундушамі і дзейнасцю шпіталяў у гарадах, прапінацыяй, забяспечыць заключэнне пагадненняў (pacta) паміж гарадамі і яўрэямі, складанне ардынацый, у якіх бы былі запісаныя і ўнармаваныя даходы і падаткі гарадоў [9, с.351–353]. Такім чынам, гарадское самакіраванне ўсё больш падпадала пад кантроль дзяржаўных органаў улады і кіравання.

Адна з інструкцый для камісіі добрага парадку знаходзіцца ў справах магістрата Ліды і дае нам магчымасць даволі дакладна высветліць мэты яе дзейнасці. У задачы камісіі ўваходзіла «горад да належнага прывесці праўлення, а ў ім да гандлю і рамёстваў ахвоту ў жыхароў справіць». Камісія па прыбыцці ў горад павінна была ўнесці каралеўскі ліст у актавыя кнігі і прадставіцца магістрату і грамадзе. Трэба было атрымаць ад магістрата ўсе гарадскія прывілеі, дэкрэты, правы, люстрацыі, рэвізіі, даўнейшыя калькуляцыі і занесці іх у свае акты. На іх аснове неабходна было стварыць уражанне пра гарадскія землі і маёмасці і запрасіць да сябе ўладальнікаў асобных маёмасцей з пацвярджальнымі дакументамі. Маёмасці, якія не былі пацверджаны адпаведнымі дакументамі, камісія павінна была вярнуць гораду. Калі было неабходна, камісія магла правесці памеру з дапамогай «дасканалага геаметра або інжынера» за кошт горада. Па выніках разгляду дакументаў і памеры павінен быў складацца інвентар або люстрацыя гарадскіх зямель і адпаведных падаткаў у гарадскую казну. Усе прыватныя маёмасці трэба было падначаліць гораду. Таксама неабходна было правесці калькуляцыю гарадскіх прыходаў і расходаў, спагнаць усе недаплаты. Пры гэтым камісія разглядала скаргі «на ўсялякія абцяжэнні падаткамі адных і вызваленне звыш слушнасці іншых». Праверцы падлягалі таксама цэхавыя прывілеі і павіннасці, належнае выкананне сваіх абавязкаў гарадскімі службоўцамі, спраўнасць захавання гарадскога архіва, ажыццяўленне ў горадзе старожы, паліцэйскіх функцый, спагнанне судовых він і пошлін і іх правільнае спажыванне. Па ўсіх недахопах камісія павінна была ўстанавіць адпаведны парадак. Калі б была высветлена неправільная выдача копій, прыняцця актаў на сведчанне, то пакрыўджаных трэба было задаволіць. Калі ў горадзе не былі прызначаны шафары або сотнікі для ведання месцкімі падаткамі і іх сборам, то камісія павінна была іх прызначыць перад войтам і магістратам пад кіраўніцтвам «генеральнага да гаспадарства і шафунку пракуратара». Таксама камісія павінна была ўдакладніць абавязкі войта. Неабходна было ўстанавіць павіннасці прадмесцяў або гарадскіх вёсак. Акрамя таго, камісія павінна была разабраць і іншыя гарадскія непарадкі, не зважаючы «ні на якія выбегі праўныя, пратэстацыі і абставіны». Па выніках сваёй работы камісія павінна была напісаць адпаведны акт і забяспечыць яго выкананне [10, а.420–422].

Дзейнасць камісій добрага парадку не мела на мэце істотных змен у парадку гарадскога самакіравання, у іх склад не ўключалі прадстаўнікоў мяшчанскага саслоўя. Таму зыходзілі яны пераважна з інтарэсаў шляхецкага саслоўя. Прагрэсіўныя дзеянні камісій мелі месца там, дзе ў іх склад уваходзілі прагрэсіўна настроеныя людзі.

У далейшым «апека» шляхецкай улады над гарадамі, разлічаная ў першую чаргу на павелічэнне прыбыткаў з іх, прывяла да падзелу магдэбургскіх гарадоў і мястэчак ВКЛ Варшаўскім экстраардынарным соймам 1775 года на 3 падатковыя класы згодна канстытуцыі «Паўторна аб гарадах і мястэчках» (1 – Вільня, Гродна, Брэст, Коўна, Мінск, Слуцк; 2 – Пінск, Навагрудак, Слонім, Ліда, Расейны, Кейданы, Друя, Чарэя; 3 – усе астатнія), а затым і да ліквідацыі згодна канстытуцыі «Устава падатка княству Літоўскаму» магдэбургскіх судоў ва ўсіх паселішчах, якія яго мелі раней, акрамя Вільні, Ліды, Трокаў, Коўны, Навагрудка, Ваўкавыска, Пінска, Мінска, Мазыра, Брэста і Гродна. Камісіям жа boni ordinis было загадана арганізаваць унутраны парадак у пакінутых магдэбургіях [9, с.398, 567].

Аднак дзейнасць камісій развівалася вельмі павольна. Больш-менш інтэнсіўная праца асобных з іх пачалася толькі напярэдадні Чатырохгадовага сейма [7, с.7]. Узаемаадносіны камісій boni ordinis з магістратамі будаваліся ў асноўным па наступных схемах: камісія накіроўвала пытанні ці даручэнні магістрату, ён іх разглядаў і дасылаў у камісію адказ; магістрат накіроўваў у камісію свае пытанні, камісія ці яе старшыня аднаасобна іх разглядалі і накіроўвалі свой адказ. Прыклад апошняга варыянту можна ўбачыць у справах лідскага магістрата. 14 лістапада 1786 года ў яго актавую кнігу была занесена рэзалюцыя камісіі добрага парадку разам з пытаннямі, якія раней накіраваў горад [11, а.8-8адв]. Магістрат Ліды цікавілі наступныя пытанні: узаемаадносіны з яўрэйскім кагалам наконт нясення ім начной і супрацьпажарнай варты, накіравання памочнікаў каморніку для вымярэння гарадскіх зямель, дастаўлення пяска і камення на будоўлю «фабрыкі» і парадак атры-

ПолесГУ

мання за гэта абпаведных «квітаў»; спагнанне войтам платы з арэндатараў на свой прыбытак; магчымасць правядзення допыту прыбываючых у горад брадзяг; парадак прызначэння пісара. Пытанні былі накіраваны за подпісамі пракуратара горада Казіміра Маскалевіча і бурмістра Яна Зянкевіча.

Можна меркаваць, што частка працы, якая была вызначана камісіі пры яе ўсталяванні, была праведзена: быў прызначаны пракуратар і шафары, усталяваны правілы адносна варты, пачаты землямерныя работы. Пры гэтым адказ, падпісаны старшынствуючым у камісіі лідскім старостам Ігнацыям Сцыпіёнам, сведчыць аб тым, што значную частку сваіх задач камісія да канца не выканала. Не была складзена ардынацыя, бо адзначалася, што пытанне аб даходах войта і горада адкладзена да прыняцця камісіяй рашэння «аб гарадскіх інтратах». Не была праведзена інвентарызацыя гарадскіх зямель, бо каморнік яшчэ працаваў. Пры гэтым камісія адзначала, што яўрэі, хоць і спасылаюцца на тое, што не маюць палёвых надзелаў, павінны даваць яму памочніка, як і горад. Адказ на пытанне аб пісары сведчыць аб незавершанай рабоце па аналізу гарадскіх прывілеяў. У ім адзначана, што спосаб вызначэння пісара павінен быць такім, як і раней. Камісія абавязала яўрэяў выконваць абавязкі па начной і супрацьпажарнай варце і брукаванню горада, у час святаў і шабасаў выдаткоўваючы пракуратару грошы на наём работнікаў. Кагал павінен быў вырашыць гэтае пытання за два тыдні. Яўрэі, як належачыя «да старосты», абавязваліся выконваць павіннасць па дастаўцы пяска і каменя на «фабрыку» пад надзорам «дыспазітара» лідскага двара, які павінен быў падтрымліваць сувязь па гэтаму пытанню з гарадскім пракуратарам. Магістрат атрымоўваў права «экзаменаваць» прыбываючых у горад людзей, але «не спосабам абдзірання».

Найбольшай паслядоўнасцю адрозніваюцца рэформы, якія праводзіў Чатырохгадовы сейм. Менавіта ён замяніў камісіі добрага парадку камісіяй паліцыі абодвух народаў і парадкавымі цывільна-вайсковымі камісіямі. У айчыннай гістарыяграфіі ў дачыненні да гарадоў рашэнні гэтага сейма зводзяцца ў асноўным да разгляду закона «Гарады нашы каралеўскія вольныя ў дзяржавах Рэчы Паспалітай» [12, с.234–235]. Аднак быў прыняцц цэлы пакет канстытуцый, якія датычыліся рэформаў гарадскіх паселішчаў: «Прынцыпы да праекта аб гарадах», «Гарады нашыя каралеўскія вольныя ў дзяржавах Рэчы Паспалітай», «Унутранае ўладкаванне гарадоў вольных Рэчы Паспалітай у Кароне і ў Вялікім княстве Літоўскім», «Папярэджанне адносна ўвядзення права аб гарадах нашых, даўней каралеўскіх, а цяпер вольных Рэчы Паспалітай», «Уладкаванне судоў гарадскіх і асэсорыі», часткова «Устава ўраду», «Сеймікі», «Кніга зямянская», «Камісія паліцыі». Пытанне кантролю органаў шляхецкай дзяржавы за гарадскім самакіраваннем знайшлі ў іх сваё адлюстраванне.

Найбольшае значэнне меў безумоўна прыняты 18 красавіка 1791 года закон «Гарады нашы карелеўскія вольныя» [13, с.215–219]. Гарады маглі прымаць рашэнні па сваіх унутраных справах са згоды камісіі паліцыі. Закон уводзіў апеляцыйныя суды, якія разглядалі справы, вырашаныя магістратамі гарадоў паісках, якія перавышалі 300 злотых і па асуджэннях звыш 3 дзён турмы, а ў першай інстанцыі – крымінальныя справы. Рашэнні яго аб вечным зняволенні і смяротным пакаранні зацвярджаў асэсарскі суд. Такім чынам адміністрацыйныя дзеянні магістратаў ставіліся пад кантроль камісіі паліцыі, а судовыя – пад кантроль асэсорыі.

Згодна канстытуцыі «Унутранае ўладкаванне гарадоў» [13, с.291–297], асаблівыя сходы ці агульныя сходы спецыяльна выбраных для гэтага ў акругах гмінных з дазволу камісіі паліцыі маглі прымаць ухвалы аб зборы падаткаў. З дазволу гэтай камісіі ўстанаўліваўся памер аплаты за працу службоўцам магістрата. У яе ж магістраты накіроўвалі рапарты аб захаванні гарадскіх правоў, вызначэнні апекуноў сіротам і ўдовам, апецы над беднымі і калекамі, раскладзе падаткаў, рашэннях сходаў мяшчан, міліцыі, касе, турме, магазінах, шпіталях. У асэсорыю на апеляцыю накіроўваліся справы звыш 3000 злотых і па пакараннях звыш 3 тыдняў турмы, а таксама крымінальных справах. Па справах, якія ўваходзілі ў паўнамоцтвы камісіі паліцыі, апеляцыя магла накіроўвацца ў гэтую камісію, якая разглядала таксама справы аб зняважанні суда.

Адпаведна канстытуцыі «Уладкаванне судоў гарадскіх і асэсорыі» [13, с.301–312], усе ніжэйшыя і апеляцыйныя суды павінны былі штоквартал інфармаваць асэсорыю аб колькасці спраў, аб справах, па якіх дапушчана апеляцыя і аб памеры сабраных судовых пошлін. Пры апеляцыйных судах уводзілася пасада адваката аддзела, які сачыў за выкананнем абавязкаў сіндзікамі, паведамляў генеральнаму адвакату асэсорыі пра дзейнасць магістратаў і судоў першай інстанцыі.

Магістраты апеляцыйных гарадоў – цэнтраў аддзела таксама адказвалі за рассылку распараджэнняў і паведамленняў вышэйшых уладаў па вольных гарадах свайго аддзела. Так, інстыгатар цывільна-вайсковай камісіі Гродзенскага павета Цыпрыян Жыглінскі 3 жніўня 1791 года прадставіў у гродзенскі магістрат загад камісіі паліцыі ад 28 ліпеня таго ж года, каб парадкавыя

Полесгу

камісіі забяспечылі накіраванне ўніверсалаў караля і Стражы правоў «ад горада да горада» і іх чытанне з амбонаў храмаў. З гэтай нагоды магістрат павінен быў забяспечыць рассылку 12 аўтэнтычных экзэмпляраў чарговага дакумента ў падведамныя паселішчы [14, с.184–187].

Акрамя таго камісіяй паліцыі былі прызначаны інтэнданты: па аднаму «ў краях абодвух народаў» і два ў Варшаве. Так, 8 мая 1792 года інтэндантам Брэсцкай зямлі быў прызначаны мельніцкі падчашыц Ян Нямцэвіч [15, а.21адв-25]. Гэтае прызначэнне разам з інструкцыяй інтэнданту было занатавана ў актавую кнігу брэсцкага магістрата 6 чэрвеня. Інструкцыя дакладна агаворвае абавязкі інтэнданта. Адзінае, што адсутнічае ў дакуменце, гэта пералік цывільна-вайсковых камісій і вольных гарадоў, якія размяшчаюцца на падведамнай Нямцэвічу тэрыторыі. Інструкцыяй вызначаліся таксама 2 стражнікі, з якімі інтэндант павінен быў з’явіцца ў «сталічны горад» сваёй «інтэнданцыі», прадставіцца парадкавым камісіям і магістратам, прысягнуць па форме, прыведзенай у інструкцыі і далажыць аб гэтым камісіі паліцыі. Агульная функцыя інтэнданта вызначана так: «вока дазорчае». У сувязі з гэтым ён не павінен быў прыбіраць сабе ўрадавай і судовай улады пад пагрозай страты пасады.

У задачы інтэнданта ўваходзіла сачыць за бяспекай, спакоем, захваннем парадку і «паліцэйскіх фундушаў» на падведамнай тэрыторыі, ажыццяўляць надзор за выкананнем парадкавымі камісіямі і магістратамі распараджэнняў камісіі паліцыі і інфарміраваць камісію аб гэтым сваімі рапартамі. Надзор павінен быў ажыццяўляцца шляхам аб’езда гарадоў, у якіх размяшчаліся цывільна-вайсковыя камісіі, і вольных гарадоў 2 разы на год: ад дня Святога Войцэха (23.04) да дня Святога Яна (24.06), а таксама ад дня Святога Міхала (29.09) да дня Святога Марціна (11.11). Галоўная мэта першага аб’езда – кантроль аўкцыёнаў паліцэйскіх фундушаў, якія па мясцовых звычаях арандуюць ад дня Святога Яна, а другога – адпаведна ад святаў Трох Каралёў (06.01) і Серадапосця. Таксама ў час наведвання гарадоў інтэндант павінен быў прымаць справаздачы ад парадкавых камісій і магістратаў аб выкананні «дыспазіцый і рэзалюцый». Інтэндант павінен быў прытрымлівацца парадка аб’езда гарадоў, які яму вызначыла камісія ў асобнай інструкцыі – «інструменце». Інтэндант не мог прадаць, замяніць і сумяшчаць пасаду, прызначаць сабе намесніка і выязджаць за межы падведамнай тэрыторыі без дазвола камісіі паліцыі.

Асноўнымі нарматыўнымі дакументамі інтэнданта былі «правы і ўставы сеймавыя», а асабліва канстытуцыі аб камісіі паліцыі, парадкавых цывільна-вайсковых камісіях і вольных гарадах. Ён павінен быў весці адпаведную дакументацыю: пратакол дзейнасці, пратакол распараджэнняў камісіі паліцыі, а таксама рапарты і дзённікі. Пратаколы накіроўваліся ў камісію ў выпадку заканчэння функцый, дзённікі штогод, рапарты – па меры неабходнасці. Рапарты павінны былі ўтрымліваць наступную інфармацыю: як адбыліся аўкцыёны; як выконваліся ўрадавыя распараджэнні; прычыны небяспекі, непарадкаў, дрэннага распараджэння маёмасцю і шляхі паляпшэння стану; ці асядаюць у гарадах іншаземцы, у тым ліку рамеснікі, і што іх стрымлівае; што перашкаджае залюдненню, гандлю і развіццю прамысловасці; ці вольныя кірмашы і таргі ад «манаполій»; якія вайсковыя адзінкі расквартэраваны ў горадзе, ці не робяць яны перашкод гараджанам і хто збірае «кватэровыя складкі» і ў якім памеры; ці накіроўваюцца на гарадскія патрэбы грамадскія даходы і фундушы горада; у якім парадку знаходзяцца вуліцы, масты, грэблі, каналы, равы, перавозы і хто збірае бруковае, маставое і інш.; як ажыццяўляецца вартавая і супрацьпажарная павіннасці; ці знаходзяцца ў горадзе могілкі, стадолы, кузні, бровары, мясніцкія яткі, мылаварні, гарбарні, ганчарскія печы; колькі пустых, старых і зруйнаваных дамоў і пляцаў і каму яны належаць; якіх найбольш дамоў, чым яны крытыя і якія коміны маюць; ці можа горад мець цагельню, лясы або прывозіць дрэва сушай ці вадою; ці ёсць у горадзе архітэктары, муляры і цесляры, каб ажыццяўляць будаўніцтва; ці ёсць у горадзе дактары, цырульнікі, аптэкары і павітухі і якога веравызнання (хрысціяне ці яўрэі); якія кірмашы, таргі і грамадскія з’езды адбываюцца ў горадзе і якія цэны на харчаванне.

Дзённік утрымліваў амаль тую ж інфармацыю, але ў адносінах да сельскай тэрыторыі, якую бачыў інтэндант, праязджаючы ад горада да горада. Апрача таго інтэндант павінен быў паведамляць аб усіх здарэннях. Яму прадпісвалася прааналізаваць колькасць насельніцтва і маёмасці на сваёй тэрыторыі, яе прыналежнасць і геаграфічную разлегласць, параўнаць яе з іншымі тэрыторыямі і ўнесці прапановы аб тым, «як маюць быць ураўнаваныя». Разам з магістратам і поштмайстрам «сталічнага» горада інтэндант павінен быў забяспечыць рэгулярную дастаўку пошты ў горад, а з яго «коннымі пахолкамі» ў іншыя гарады і назад. У канцы года магістраты вольных гарадоў павінны былі разлічыцца за дастаўку пошты. Магістрат апеляцыйнага горада павінен быў заўсёды ведаць, дзе знаходзіцца інтэндант. Апошні абавязаны быў сачыць за дзейнасцю судоў

ПолесГУ

першай інстанцыі, дазорцаў і службовых асоб і інфарміраваць аб гэтым камісію. Нядбайнасць і злачынствы, здзейсненыя інтэндантам, павінны былі разглядаць установы першай інстанцыі.

Аднолькавую пасаду і інструкцыю ў Гродне атрымаў Караль Эйдзяловіч і занёс яе ў актавую кнігу гродзенскага магістрата 27 чэрвеня 1792 года [14, с.893–904].

Захвалася пасада інтэнданта і пасля другога падзела Рэчы Паспалітай. Так у Брэсце яе атрымаў 17.02.1794 года Ян Гарайн. Было ўдакладнена, што яго «аддзел» уключае землі Брэсцкую, Бярозаўскую, Кобрынскую, Слонімскую і Ваўкавыскую. Абавязкі інтэнданта поўнасцю адпавядалі прыведзенай вышэй інструкцыі [15, а.28–29об].

**Заключэнне.** Такім чынам шляхецкая дзяржава, праводзячы ў другой палове XVIII стагоддзя рэформы, усталявала даволі пільны кантроль за справамі гарадоў. Гэта было абумоўлена тым, што апошнія з'яўляліся крыніцамі прыбыткаў дзяржаўнага скарбу. Кантроль у выглядзе камісій добрага парадку быў такім жа ненадзейным і амаль безвыніковым, як і самі рэформы 60-70 гадоў XVIII стагоддзя. Рэформы Чатырохгадовага сейма пачалі фарміраваць агульнадзяржаўнае гарадское заканадаўства з адпаведнай цэнтралізаванай структурай кіравання гарадскімі справамі. Гарадскія справы былі спачатку пастаўлены пад кантроль парадкавых цывільна-вайсковых камісій адпаведных ваяводстваў і паветаў. Прыняцце канстытуцыі «Гарады нашы вольныя» яе адмяняе. Прадстаўнікі мяшчан трапілі ў склад камісій скарбу і паліцыі, а таксама ў асэсорыю. Магістраты павінны былі падтрымліваць сталыя сувязі з магістратам аддзела, асэсорыяй і камісіяй паліцый, узгадняць з імі свае рашэнні. Да таго ж шляхецкая апека над гарадамі праяўлялася ў прызначэнні інтэндантаў, якія, як «урадвае вока», павінны былі пільна сачыць за ўсімі гарадскімі справамі. Разам з тым, не валодаючы ўладнымі паўнамоцтвамі, карэкціроўку дзейнасці магістратаў яны пакідалі камісіі паліцыі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т.4. Кадэты – Ляшчэня / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.]; Маст. Э.Э.Жакевіч. – Мінск: Бел Эн, 1997. – 432 с.
2. Вялікае княства Літоўскае: ВКЛ: энцыклапедыя. У 2 т.; рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш]; мастак З.Э. Герасімовіч. 2-е выданне. Т.2. – Мінск : «Беларуская энцыклапедыя імя Пятруся Броўскі», 2006. – 792 с.
3. Gordziejew, J. Próby reform miejskich w Grodnie w okresie Oświecenia / J.Gordziejew // Rocznik Biblioteki Naukowej PAU i PAN w Krakowie. – Kraków. – 2001. – R.46.
4. Gordzejew, Jerzy. Komisje Porządkowe Cywilno-Wojskowe w Wielkim Księstwie Litewskim w okresie Siejmu Czteroletniego (1789-1792) / Jerzy Gordzejew. – Kraków: Wydawnictwo uniwersitetu Jagellonskiego, 2010. – 352 s.
5. Стрэнкоўскі, С.П. Прывілеі і вольнасці беларускіх гарадоў з нямецкім правам у канцы XIV – канцы XVIII стагоддзя: Манаграфія / С.П. Стрэнкоўскі. – Мінск : МГІРА, 2008. – 251с.
6. Volumina legum: Przedruk zbioru praw staraniem XX.Pijarow w Warszawie od roku 1732 do roku 1782 wzdanego. – Petersburg: nakładem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1860. – T.7. – 403, XI s.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Фонд 1813. – Воп.1. – Сп.1. Актавая кніга Ліпскага магістрата.
8. Baranowski, I. Komisye porządkowe (1765 – 1788) / I. Baranowski. – Kraków: nakładem Akademii Umiejętności, 1907. – 46 s.
9. Volumina legum: Przedruk zbioru praw staraniem XX.Pijarow w Warszawie od roku 1732 do roku 1782 wzdanego. – Petersburg: nakładem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1860. – T.8. – 590, XXXIV s.
10. НГАБ. Фонд 1718. – Воп.1. – Сп.2. Актавая кніга Лідскага магістрата.
11. НГАБ. Фонд 1718. – Воп.1. – Сп.4. Актавая кніга Лідскага магістрата.
12. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М.Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Минск: Экаперспектыва, 2000 – 2005. – Т.3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII – XVIII стст.) / Ю.Бохан [і інш.] – 2004. – 344с.
13. Volumina legum. – Kraków: nakładem Akademii umiejętnośći, 1889. – T.9. – 503 s.
14. НГАБ. Фонд 1761. – Воп.1. – Сп.15. Актавая кніга Гродзенскага магістрата.
15. НГАБ. Фонд 1786. – Воп.1. – Сп.10. Актавая кніга Брэсцкага магістрата.


Полесгу

## GENTRY STATE CONTROL OVER THE CITY SELF-GOVERNMENT IN THE SECOND HALF OF THE XVIII CENTURY

***S.P. STRENKOVSKIY***

***Summary***

The article considers the issues of guardianship, installed by gentry state over the self-government of towns of the Grand Duchy of Lithuania in the period of the reforms of the state system of Rzech Pospolita in the 60-s – 90-th of the 18th century. Based on the example of some cities, the author considers the activities of the committees of the «good order» and the police providers’ committee of both peoples. The statutes about the relationship of the city self-government organs with the police commission and assessor court are also given in the article. Control over the city's institutions was due to the need to replenish the state treasury and also due to the contradictions that existed in the nobles' state of opinion in relation to the towns and petty bourgeoisie.

© Стренковский С.П.

*Поступила в редакцию 02.09.2011*

Полесгу